**Литература**

1 Шанский, Н. М. Фразеология современного русского языка / Н. М. Шанский. – Санкт-Петербург : Специальная литература, 1996. – 192 с.

2 邵敬敏 (Шао Цзинминь). – 现代汉语通论.上海: 上海教育出版社, 2002. – 180 页.

3 Барчукова, К. В. Фразеология в китайском языке [Электронный ресурс] / К. В. Барчукова, А. В. Пескова, Е. И. Подкидышева, В. Э. Скромных // Молодой ученый. – 2015. – № 18. – С. 514–517. – Режим доступа: //moluch.ru/archive/98/22035/. – Дата доступа: 15.02.2023.

**УДК 821.161.3-32*А.Казлоў:398(-161.3)**

***І. Р. Шпалок***

# МІСТЫКА ЯК МАСТАЦКАЯ ДАМІНАНТА АПОВЕСЦІ “НЕЗЛАМАНАЯ СВЕЧКА” АНАТОЛЯ КАЗЛОВА

*Артыкул прысвечаны даследаванню асаблівасцей увядзення ў сюжэт містычных элементаў, вызначэнню іх мастацкай ролі. На прыкладзе аповесці А. Казлова “Незламаная свечка”, выдадзенай у 2002 г. у аднаўленным зборніку, асэнсоўваюцца прычыны звароту пісьменніка да містыкі, робіцца агляд аўтарскай міфалогіі, вызначаюцца спосабы стварэння таямнічай атмасферы ў творы.*

Зборнік А. Казлова “Незламаная свечка”, які выйшаў у 2000 годзе, складаецца з чатырох аповесцей у процівагу папярэднім кнігам “Міражы ценяў” і “І тады я памёр…”, дзе асноўнай формай быў малы эпас. Як зазначае І. Шаўлякова, “зварот да жанру аповесці даў магчымасць празаіку больш поўна, чым тое дазвалялі абмежжы апавядання (“малога эпасу”), паказаць не проста кропкі, “моманты” судакранання нашага і нянашага светаў, але абгрунтаваць ідэю пра адсутнасць колькі-небудзь пэўнага бар’еру… паміж імі” [1, с. 58]. Акрамя таго, у адрозненне ад папярэдніх кніг, А. Казлоў у зборніку “Незламаная свечка” не карыстаецца беларускай і агульнаславянскай вуснапаэтычнай спадчынай, а ставарае аўтарскую міфалогію на аснове веры вясковых жыхароў у паранармальныя з’явы. У гэтым сэнсе можна гаварыць пра містыку як мастацкую дамінанту твораў А. Казлова.

Шлях пераходу ад выкарыстання матываў і вобразаў беларускага фальклору да стварэння ўласнай міфалогіі назіраўся яшчэ ў асобных творах са зборнікаў 1990-х гадоў. Напрыклад, у апавяданні “Матрац” аўтар карыстаецца празапапеяй і стварае аўтарскі вобраз матраца – альтэр-эга галоўнага героя; у апавяданні “Крывавы прысмак” узнікае адмысловы вобраз Смерці-матухны. Такія творы былі, на нашу думку, “спробай пяра” пісьменніка ў пошуках уласнай праблематыкі і стылю, а таму ў зборніку “Незламаная свечка”, як слушна зазначае І. Шаўлякова, “прыярытэты празаіка А. Казлова на мяжы стагоддзяў і тысячагоддзяў падаваліся ўжо не проста выразна акрэсленымі, але і згрупаванымі, сістэматызаванымі…” [1, с. 61].

Пад містыкай у мастацкім творы прынята разумець выкарыстанне пісьменнікам пэўных прыёмаў і вобразаў з мэтай стварэння таямнічай атмасферы, што выклікае ў чытача трывожны настрой і негатыўныя эмоцыі – жах або страх. Гэтыя элементы мастацкага твора ў А. Казлова звязаны не толькі з катэгорыяй ірэальнасці, але і амаральнасці. Так, у аповесці “Незламаная свечка” А. Казлоў падае гісторыю

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

варагавання Смалякоў і Барташэвічаў. Першым элементам стварэння містыкі тут з’яўляецца вера сяльчан у патубаковае. І. Шаўлякова недарэмна называе гэтую аповесць “вясковай”: “<...> «Незламаную свечку» і «Перакуліся, перакуленае» дазволім сабе паводле шэрагу прыкмет аб’яднаць назовам «вясковыя»” [1, с. 62]. Пачынаецца твор з унутранага маналога Марфы Смаляк, функцыя якой напачатку твора заключаецца ў стварэнні адпаведнага вясковага каларыту. Выкарыстанне “трасянкі”, дыялектная і размоўная лексіка (“нямашака”, “плявузгнуць”, “кашолка” і інш.) дазваляе празаіку стварыць вобраз старой жанчыны. Так, праз маўленне Марфы Смаляк аўтар паведамляе чытачу пра месца дзеяння твора – вёску.

Другім сродкам стварэння містыкі з’яўляецца хранікальны сюжэт, падзеі якога падпарадкаваны прынцыпу градацыі: з кожным новым эпізодам напружанне чытача ўзмацняецца. Так, спачатку аповед вядзецца пра Марфу і пра паведамленне ёй пра смерць Сяргея Смаляка, далей Галя Смаляк даведваецца пра смерць мужа; потым празаік паказвае паход Сяргея Смаляка і Івана Перунова ў лес, у якім гіне Сяргей, і г. д.

Аўтар “гуляе” з “гарызонтам чытацкіх чаканняў”, што з’яўляецца трэцім сродкам стварэння містыкі. У пачатку твора падаюцца апісанні прыроды, побыт Марфы Смаляк, якая займаецца шараговай будзённай справай – тчэ палавікі: “Пачынаўся сакавік. Нягеглахлюпкі месяц з шаравата-белай размазнёй-кашыцай талага снегу… Па ўсім бачылася, што вясна будзе ранняя: паласкаліся, вымываліся ў ручаінах талага снегу сініцы, неўгамонна, папалуднях чвыркаталі вераб’і на электрычным дроце слупоў” [2, с. 78]. І далей: “Марфа шчаслівa ўсміхалася сама сабе, усміхалася думкам і вясне за акном” [2, с. 79]. Такім чынам А. Казлоў пераконвае чытача ў рэалістычнасці аповесці, што потым абвяргаецца з’яўленнем прывіду Сяргея Смаляка.

Твор умоўна можна падзяліць на дзве часткі – да і пасля з’яўлення прывіду, што абумоўлена выкарыстаннем містыкі. Адсутнасць “татальнай” прысутнасці звышнатуральнага ў аповесці і ўвага наратара да сям’і Смалякоў характарызуе першую частку, але, трэба сказаць, што намёкі на смерць Сяргея ёсць ужо тут. Гэта вынікае са слоў Марфы і эпізоду з кепскімі прадчуваннямі Галі: “Пачакаю, калі ўсе збяруцца, тады і паямо. Адной кавалак у горла не лезе” [2, с. 80]; “Ой, Божа найвышні, нешта нядобрае стукаецца ў дзверы нашай хаты” [2, с. 82]; “Раптам ні з таго ні з сяго кальнула ў грудзях у Галі Смаляк” [2, с. 84]. Чытач сустракаецца з сапраўднай містыкай толькі пасля падрабязнага апісання смерці Сяргея: “Смаляк азірнуўся… На яго, як страла, ляцела доўгая, таўшчынёй з руку, сухастоіна… Калі Сяргей убачыў сухастоіну-стралу, яна была ад яго ў трох метрах… І затым усё спынілася. Сяргей застыў, як паралізаваны, на месцы, а сухастоіна-страла ціха-ціхенька, па-мурашынаму паўзе, ляціць на яго” [2, с. 92]. І далей: “Іван і два разы вачамі не міргнуў, як сухастоіна ўрэзалася абламаным, няроўным канцом у скроню Сяргея Смаляка… Усё навокал заліло чырванню” [2, с. 93]. Гэты эпізод на кантрасце з папярэднімі ціхамірнымі апісаннямі прыроды ўзмацняе ўласцівае твору трывожна-жахлівае гучанне.

Другая частка аповесці характарызуецца большай містычнасцю, чым першая. Увага наратара тут скіравана на сям’ю Барташэвічаў, пра іх канфлікт са Смалякамі распавядае Сяргей: “Наш прапрадзед і Барташэвічаў наймацнейшымі сябрамі лічыліся… І ўлюбіліся, укахаліся ў адну дзяўчыну… Але, пачалі наш прапрадзед і Барташэвічаў варагаваць між сабою… Прапрадзед дзед Смаляк смехам узяў зямлі прыгаршчы ды і сыпануў у вочы Барташэвічу… І ахапіла барташэвіцкага прапрадзеда ярка-сіняе полымя. За адзін уздых ён згарэў…” [2, с. 99–100].

Містычнасці надае аповесці і пакладзеная ў аснову яе мастацкай задумы бінарная апазіцыя “хрысціянскі–язычніцкі”, якая ўвасабляецца ў варагаванні Смалякоў і Барташэвічаў. Першыя паказаны шчырымі вернікамі, пра што сведчаць выказванні

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Марфы Смаляк і яе ж прапанова да Надзькі Барташэвіч разламаць свечку, каб скончыць варагаванне: “<...> памаліся, стоячы перад абразамі на каленях, і пераламайце ўдвух асвечаную ў царкве грамнічную свечку” [2, с. 119]. Прыхільнікамі паганскіх звычаяў выглядаюць Барташэвічы, на што, напрыклад, паказваюць замовы Надзькі, якая адмаўляецца паламаць свечку: “Хітрасць лісіцы, сіла ваўка, моц навальніцы, злаба перуна ў костках, суставах, у сэрцы маім” [2, с. 103]. І далей: “Надзька, ні слова не кажучы, крутанулася на месцы і, ляпнуўшы дзвярыма, выскачала ў сенцы” [2, с. 119].

Асобна трэба разгледзець тыя часткі твора, дзе распавядаецца пра “**Нешта**”. Па словах І. Шаўляковай, гэта “не які-небудзь міфалагічны нячысцік ці фальклорны персанаж, але Безасабовае **Яно / Нешта**” [1, с. 62]. У творы назва гэтага персанажа вылучаецца тлустым шрыфтам, што павышае значнасць вобраза для разумення канцэпцыі твора. Упершыню **Яно** з’яўляецца ў эпізодзе пра хвойку: “А сасоначка расла, расла і радавалася, пакуль цёмнай і мокрай восеньскай ноччу не прыйшло да яе **Нешта**. Яно пасялілася ў карэнні, ствол, галінкі. **Нешта** акруціла сасоначку, выпіла да донца яе радасць, забрало шчасце, адняло сілу” [2, с. 109–110]. Так А. Казлоў спрабуе асэнсаваць адмоўныя якасці псіхікі чалавека, яго грахоўнасць і амаральнасць, адначасова паказваючы, што “**Нешта**” “губіць усё, да чаго дакранаецца”, бо пасля наведвання магілы бацькі, дзе Антон Смаляк дамаўляецца з “**Нечым**”, ён трапляе пад лёд: “І падыходзіць ён, бязгрэшны, чысты, свежы… Ён, **Нешта**, твой… Антон стаіць каля зламанай бядовай сасоначкі-сухастоіны. І дзе, адкуль узяць тую сілу, якая б секанула іх? А то яны да вяселля ўжо трахтуюцца-рыхтуюцца. <…>. Перадапошні палавік Марфа склала гармонікам, адвярнулася ад панеўкі… Праз некалькі хвілін азірнулася, ды няма Антона… Над вадой парасончыкам уздуўся Антонаў палітончык. Марфа… вышмаргнула ўнука на лёд…” [2, с. 123]. У народных уяўленнях Антон гіне не фізічна, а ў якасці “чыстага”, маральнага чалавека, бо ў фінале аповесці помсціць сям’і Барташэвічаў, забіваючы з дапамогай “**Нечага**” Косціка Барташэвіча: “<...> сарваў са старога крыжа фартушок, прыгнуўся і з ледзь бачных, прыгладжаных часам, курганкоў магіл узяў пяць шчэпцяў зямлі… Тры разы абышоў ён вакол хаты [Барташэвічаў. – І. Ш.], і лёгкі жоўты пясок трыма ланцугамі акруціў, сціснуў яе…” [2, с. 124–125]. Як слушна зазначае Я. Конеў, “магія, да якой звяртаюцца персанажы, нікому не дапамагае, адно псуе жыццё. Героі звяртаюцца да магіі, паколькі ніхто з іх нават не задумваецца наконт такіх простых ісцін, як каханне, дараванне, дабрыня, спагада” [3, с. 92].

Такім чынам містыка з’яўляецца мастацкай дамінантай аповесці “Незламаная свечка” А. Казлова і рэалізуецца ў творы праз вясковы каларыт, хранікальны сюжэт, спалучаны з эфектам градацыі, змену ў “гарызонце чытацкіх чаканняў”, бінарную апазіцыю “хрысціянскі–язычніцкі” як аснову мастацкай канцэпцыі твора. А. Казлоў стварае вобраз безасабовага “**Нешта**”, праз якое спрабуе асэнсаваць заганныя якасці псіхікі чалавека, вартасць яго маральных рысаў.

### Літаратура


1 Шаўлякова, І. Л. Сапраўдныя хронікі Поўні: артыкулы і рэцэнзіі / І. Л. Шаўлякова // Правілы адасаблення / І. Л. Шаўлякова. – Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2011. – С. 58–63.

2 Казлоў, А. С. Незламаная свечка: аповесці / А. С. Казлоў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2000. – 222 с.

3 Конеў, Я. Асноўны інстынкт / Я. Конеў // Маладосць. – 2011. – № 12. – С. 91–92.




РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ